

**Абласны этап рэспубліканскага конкурсу**
**«Беларусь – мая Радзіма»**

**Народны музей гісторыі ўстановы адукацыі**
**«Мар’інагорскі дзяржаўны ордэна «Знак Пашаны» аграрна-тэхнічны каледж імя У.Е.Лабанка»**

## Экскурсійны маршрут

# БАЧЫЦЬ, КАБ ВЕДАЦЬ І ПАМЯТАЦЬ


***Распрацаваў навучэнец II курса Гушчын Сяргей***
***Кіраўнік – Свірыдава Алена Валянцінаўна***

# БАЧЫЦЬ, КАБ ВЕДАЦЬ І ПАМЯТАЦЬ

Экскурсійны маршрут «Бачыць, каб ведаць і памятаць» уключае аб’екты, размешчаныя ў горадзе Мар’іна Горка:

- Помнік Герою Савецкага Саюза Васілю Токараву;
- Помнік падпольшчыцы Любові Гайдучонак;
- Стэла ў памяць пра воінаў, партызанаў, падпольшчыкаў, якія загінулі ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі, ад вечна ўдзячных жывых;
- Помнік-САУ у гонар танкістаў-вызваліцеляў горада;
- Камень у памяць пра расстраляных у кастрычніку 1941 года чырвонаармейцах;
- Інфармацыйны стэнд, прысвечаны Героям Савецкага Саюза – ураджэнцам Пухавіцкага раёна.

Экскурсійны маршрут «Бачыць, каб ведаць і памятаць» змяшчае інфармацыю пра выдатных землякоў-выпускнікоў установы адукацыі, якія набліжалі Перамогу:

- Герой Савецкага Саюза Уладзімір Лабанок;
- Поўны кавалер Ордэна Славы Аляксандр Далідовіч.



# Экскурсійны маршрут
# БАЧЫЦЬ, КАБ ВЕДАЦЬ І ПАМЯТАЦЬ




***Горад Мар’іна Горка***



# Помнік Герою Савецкага Саюза Васілю Токараву



**Горад Мар'іна Горка**

**Вуліца Кастрычнічкая**

**Бераг ракі Цітаўка**

***Каардынаты***
**53.521389, 28.137778**



Помнік Герою Савецкага Саюза

**Васілю Фёдаравічу Токараву** – удзельніку вызвалення Пухавіччыны. 4 ліпеня 1944 года ўдзельнічаў у адбіцці шасці контратак праціўніка каля вёскі Узляны. Паранены, не пакінуў поля бою. Памёр ад ран 4 ліпеня 1944 года. Помнік В.Ф.Токараву размешчаны на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў час вызвалення раёна. Узведзены 4 ліпеня 1950 года.





# Помнік камасамолцы-партызанцы Любе Гайдучонак



**Горад Мар'іна Горка**

**Вуліца Кастрычнічкая**

**Гарадскі парк культуры і адпачынку**

***Каардынаты***
**53.519722, 28.139166**

**Помнік узведзены ў 1972 годзе**



Камсамолка-партызанка

**Любоў Георгіеўна Гайдучонак** нястомна працавала над стварэннем падпольных арганізацый моладзі. У маі 1943 года, выконваючы адно з баявых заданняў, трапіла з таварышамі ў нямецкую засаду. Параненая ў нагу, не магла схавацца ад ворагаў, прыкрыла адход партызанаў і, не жадаючы трапіць у рукі ворага, застрэлілася.







# Помнік савецкім воінам, партызанам і падпольшчыкам, загінуўшым у барацьбе з фашысцкімі захопнікамі

**Горад Мар’іна Горка**

**Вуліца Кастрычнічкая**

**Прывакзальная плошча**

***Каардынаты***
**53.510398, 28.143572**
**Помнік узведзены ў 1970 годзе**



# Помнік савецкім воінам, партызанам і падпольшчыкам, загінуўшым у барацьбе з фашысцкімі захопнікамі

Размешчана інфармацыя пра тое, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Пухавіцкага раёна дзейнічалі партызанскія брыгады “Беларусь”, “Буравеснік”, імя Калініна, “Полымя”, 1-я, 2-я, 3-я Мінскія, асобныя партызанскія атрады “Мясцовыя”, “Мсціўцы”; а таксама і пра тое, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны з ліпеня 1941 года да студзен 1944 года ў горадзе Мар’іна Горка дзейнічала партыйна-камсамольскае падполле пад кіраўніцтвам Пухавіцкага падпольнага райкама КП (б).





# Помнік-САУ у гонар танкістаў-вызваліцелей горада



**Горад Мар’іна Горка**

**Вуліца Кастрычнічкая**

**Прывакзальная плошча**

***Каардынаты***
**53.510277, 28.143333**
**Помнік узведзены ў 1973 годзе, у 2014 годзе перамешчаны на другі бок прывакзальнай плошчы**



**На помніку ў гонар танкістаў-вызваліцелей горада** размешчана інфармацыя, што Пухавіцкі раён вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 2 ліпеня 1944 года войскамі 3-й, 48-й, 65-й армій і 16-й паветранай арміі 1-га Беларускага фронта ва ўзаемадзеянні з мясцовымі партызанскімі злучэннямі і падпольнымі арганізацыямі.







# Камень у памяць пра чырвонаармейцаў, расстраляных фашыстамі восенню 1941 года на станцыі Пухавічы

**Горад Мар'іна Горка**

**Вуліца Кастрычнічкая,73**

**Пухавіцкі раённы ваенны камісарыят**

***Каардынаты***
**53.506388, 28.146111**
**Помнік узведзены ў 2007 годзе**



У канцы чэрвеня 1941 года раён быў акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Ворагі занялі ваенны гарадок у Мар’іна Горцы, аэрадромы ў Сінчы, Скобраўцы, Пухавічах. У вялікіх населеных пунктах з’явіліся гітлераўскія гарнізоны. У канцы верасня 1941 года каля вёскі Блонь ва ўрочышчы Папова Горка было расстраляна 1200 грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці з горада Мар’іна Горка і вёскі Пухавічы. У кастрычніку 1941 года на чыгуначнай станцыі Пухавічы было расстраляна больш за 200 ваеннапалонных Чырвонай Арміі.







# Стэнд «Героі Пухавіччыны»

**Горад Мар’іна Горка**

**Вуліца Ленінская**

**Пухавіцкі раённы**
**выканаўчы камітэт**

***Каардынаты***
**53.510337, 28.148296**





# Героі Савецкага Саюза –ураджэнцы Пухавіцкага раёна

**Пётр Гучок**
**Міхаіл Зялёнкін**
**Пётр Касцючык**
**Аляксей Крайко**
**Андрэй Луцэвіч**
**Алена Мазанік,**
**Уладзімір Лабанок**







**поўны кавалер ордэна Славы Аляксандр Далідовіч**



# Герой Савецкага Саюза Уладзімір Лабанок

***выпускнік***

***Мар’інагорскага сельскагаспадарчага тэхнікума***









# Цікавыя факты пра Уладзіміра Лабанка



Нарадзіўся 3 ліпеня 1907 года ў вёсцы Востраў Пухавіцкага раёна.

Хлопцу было ўсяго 2 гады, калі бацька паехаў у Амерыку – болей сын з бацькам не бачыліся.

У 1927 годзе скончыў установу адукацыі, якая зараз называецца «Мар'інагорскі дзяржаўны ордэна «Знак Пашаны» аграрна-тэхнічны каледж імя У.Е.Лабанка» (імя прысвоена 24 снежня 1984 года). У 1931 годзе атрымаў вышэйшую адукацыю ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны быў прызначаны Першым сакратаром Лелельскага райкама партыі; не паспеў перавезці сям'ю – таму з роднымі не бачыўся да вызввалення Беарусі ў 1944 годзе. У жніўні 1941 года стаў першым сакратаром Лепельскага падпольнага райкама. Быў зусім не падобны на ваеначальніка: невысокага росту, валодаў ціхім голасам, але гэта не перашкодзіла кіраваць Полацка-Лепельскай партызанскай зонай - 16 брыгад, 17 тысяч байцов, 287 кіламеткаў рубяжоў. Ва ўсіх істотных аперацыях прымаў удзел сам – на яго рахунку 17 забітых немцаў, 3 узарваных эшалона, 5 аўтамашын, 11 узарваных і спаленых мастоў. Званне Героя Савецкага Саюза атрымаў 16 верасня 1943 года. У маі 1944 года арганізаваў прарыў, вывеўшы 15 тысяч мірных жыхароў з нямецкага акружэння. За гэтую аперацыю ўзнагароджаны Ордэнам Суворава 1-й ступені – адзіны партызан, які меў такую ўзнагароду. Памёр 4 лістапада 1984 года.

# Поўны кавалер Ордэна Славы Аляксандр Далідовіч

*выпускнік*
*Мар'інагорскага сельскагаспадарчага тэхнікума*







**Адзін з 29 поўных кавалераў, узнагароджаных <u>чатырма</u> ордэнамі Славы (двума ордэнамі Славы 3-й ступені).**

# Слаўная гісторыя Аляксандра Далідовіча

Нарадзіўся 2 жніўня 1914 года ў вёсцы Ямнае Пухавіцкага раёна.

У 1934 годзе скончыў установу адукацыі, якая зараз называецца «Мар'інагорскі дзяржаўны ордэна «Знак Пашаны» аграрна-тэхнічны каледж імя У.Е.Лабанка».

## У баях Вялікай Айчыннай вайны з ліпеня 1941 года.



Ваяваў на Карэльскім і 2-м Беларускім франтах. Наводчык кулямёта 1063-га стралковага палка малодшы сяржант Аляксандр Далідовіч 22 чэрвеня 1944 года падчас прарыву абароны ворага на рацэ Свір, у складзе групы разведчыкаў пераправіўся праз раку, усталяваў размяшчэнне некалькіх варожых агнявых кропак і ўдзельнічаў у падаўленні пяці з іх. Група захапіла ў палон трыццаць восем фінскіх салдат. **За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях, загадам па 272-й стралковай дывізіі (015/н) ад 6 ліпеня 1944 года малодшы сяржант Далідовіч Аляксандр Ільіч узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені**. У канцы студзеня 1945 года ў баі за населены пункт Клайн-Кюдэ сяржант Далідовіч першым пайшоў у атаку на ворага і сваімі дзеяннямі натхніў астатніх байцоў. У гэтым баі забіў трох немцаў, у тым ліку аднаго афіцэра, які спрабаваў узарваць мост. Падчас бою за населены пункт Ной-Хютэн быў абкружаны немцамі, расстрэльваў іх з аўтамата. Рассеяўшы большую частку з іх і бачачы, што яшчэ група немцаў насядае на яго, інсцэніраваў здачу ў палон і, калі яны падышлі да яго на блізкую адлегласць, трох з іх забіў, а астатніх захапіў у палон і даставіў на камандны пункт палка. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях, загадам па 272-й стралковай дывізіі ад 8 сакавіка 1945 года малодшы сяржант Далідовіч Аляксандр Ільіч узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, які быў уручаны толькі ў 1949 годзе.

28 студзеня 1945 года снайпер узвода пешай разведкі 1063-га стралковага палка сяржант Аляксандр Далідовіч падчас наступальных баёў забіў трох гітлераўцаў. 14 сакавіка 1945 года ў баі за горад Кольберг (цяпер — горад Калабжэг, Польшча) сяржант Далідовіч падпоўз да агнявой кропкі ворага і закідаў яе гранатамі, падарваўшы кулямёт з трыма гітлераўцамі. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях, загадам камандуючага войскамі 19-й арміі ад 17 красавіка 1945 года малодшы сяржант Далідовіч Аляксандр Ільіч узнагароджаны ордэнам Славы 2-й ступені.

4 красавіка 1945 года група разведчыкаў на чале з сяржантам Аляксандрам Далідовічам пад ураганным артылерыйска-мінамётным агнём ворага пераадолела драцяныя загароды, пранікла ў варожыя траншэі і знішчыла вялікую колькасць гітлераўцаў, што аблягчыла захоп населенага пункта Погарш, размешчанага ў пяці кіламетрах на поўнач ад горада Гдыня. У гэтым баі сяржант Далідовіч асабіста знішчыў шасцярых гітлераўскіх салдат.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 31 мая 1945 года за ўзорнае выкананне заданняў камандавання з баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі сяржант Далідовіч Аляксандр Ільіч узнагароджаны ордэнам Славы 1-й ступені, стаўшы поўным кавалерам ордэна Славы.

# Спіс выкарыстаных крыніц

1 Далідовіч Аляксандр Ільіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/Аляксандр_Ільіч_Далідовіч. - Дата доступу: 15.08.2025

2 Котеленец, А. Советские партизаны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://profilib.org. – Дата доступу: 15.08.2025

3 Памяць: Пухавіцкі раён: Гіст.-дак. Хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі/ Укл. А.А.Пpановіч. – Мінск: Беларусь, 2003. – 749 с.

4 Пуховичский район. В самом сердце Беларуси. – Минск: УП “РИФТУР”, 2009. – 56 с.

5 Пушкін, Я., Ткачоў, М. Камсамольскі камісар/ Я.Пушкін, М.Ткачоў. – Мінск: Беларусь, 1969. – 40 с.

6 Токарев Василий Федорович [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://новокузнецк400.рф/persons/148-tokarev.html. - Дата доступу: 15.08.2025





# БАЧЫЦЬ,

# КАБ ВЕДАЦЬ,

# ПАМЯТАЦЬ,

# НЕ ПАЎТАРЫЦЬ